УДК 882.6 (092)

А. С. Лейко

Навук. кір. – Т. А. Аляшкевіч, канд. філал. навук, дацэнт

# СЕМАНТЫКА ЖАНРУ ЗНОМАЎ АЛЕСЯ РАЗАНАВА

Прадметам увагі ў артыкуле выступае семантыка зномаў А. Разанава. Адзначана, што жанр зномаў з‟яўляецца неакрэсленым. Творам характэрна жанравая дыфузнасць. Такая акалічнасць цалкам надае зномам статус наватарскага жанру, што, адпаведна прадвызначае і іх семантычныя асаблівасці. Найперш гэта самарэфлексіі над рознымі фактамі, з‟явамі і праявамі ў паўсядзенным жыцці, у літаратурным працэсе, у супярэчнасцях рэчаіснасці.

Алесь Разанаў – паэт-наватар, адзін з самых яркіх прадстаўнікоў інтэлектуальнага напрамку ў беларускай літаратуры. З яго імем звязаны найбольш цікавыя знаходкі ў галіне фарматворчасці. Сярод іх версэты, вершаказы, квантэмы, зномы, пункціры. Нашу ўвагу спынім на зномах. Зномы – аўтарскія трапныя выслоўі – з‟яўляюцца не толькі эстэтычнымі, але гнасеалагічнымі адзінкамі, якія раскрываюць погляд паэта на пазнанне свету ў самых розных яго праявах: ад разумення, што ѐсць цела, да імкнення вытлумачыць, што ѐсць смерць. Зномы – гэта філасофска-паэтычныя назіранні, у якіх прысутнічаюць вобразы, інтанацыя, гукі, безумоўна, паэтычная філасофія. Думкі ў зномах не рассейваюцца, а згортваюцца амаль да афарызма. Адсутнаць рыфмы часам замяняецца наяўнасцю рытма, які ў дадзеных мастацкіх тэкстах узмацняе праяўленне філасофскага сэнсу: «Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова» [1, с. 4]. 63 Абраная А. Разанавым форма зномаў падкрэслівае неардынарнасць асобы самога паэта, нязвыкласць і неардынарнасць думкі і формы яго твораў. Цікава тое, што ўсѐ зразумелае і простае на першы погляд у зномах, аказваецца складаным, зашыфраваным, тым, што прымушае задумацца, памедытаваць, адрэфліксіраваць. У дадзеным артыкуле мы ставім на мэце прааналізаваць семантыку жанру зномаў, прадстаўленых у кнізе «Сума немагчымасцяў». Гаворачы аб зномах А. Разанава, нельга не адзначыць, што яны вельмі разнастайныя як па змесце, так і па форме. Таму вельмі складана вылучыць нейкія агульныя рысы, уласцівыя дадзенаму жанру. Цяжкасці ўзнікаюць, у першую чаргу пры спробе выразнага вызначэння самой дэфініцыі, што ѐсць зном, якія яго жанравыя канстанты, што выступае «ўнутранай мерай» гэтага жанру. У зномах найперш праявілася заўважаная літаратуразнаўцамі ўніверсальная прыкмета мастацкай свядомасці пісьменнікаў ХХ ст. – «эсэістычнасць мыслення» [3, с. 133], якая дае нам падставы надаць філасофскі статус разанаўскаму жанру. Па словах самога паэта, «зномы напачатку не мелі такой назвы, ішлі як нататкі, нават як філасафемы» [4, с. 7]. Прыроду паходжання дадзенага жанру сам А. Разанаў выводзіць ад слова “зно”, якое тлумачыць наступным чынам: «Той, хто спазнае, і тое, што спазнаецца, твораць новую рэчаіснасць – Зно. У гэтай рэчаіснасці знікае падзел на суб‟ект і аб‟ект, і яна новая не таму, што настае пасля нечага, а таму, што ніколі не была старой» [1, с. 73]. Але гэта не спрашчае, а, наадварот, ускладняе задачу. Зномы падобныя да выказвання, назірання, роздуму, маюць рысы эсэістычнасці, часам афармленыя ў форме афарызму. Такая неакрэсленасць, жанравая дыфузнасць цалкам надае зномам статус наватарскага жанру, з другога боку, пры супастаўленні такіх твораў з эсэ, афарызмам, нататкай узнікае магчымасць прасачыць і пэўную традыцыю, наследаванне тых ці іншых рысаў ад названых жанраў. На фоне ўсѐй паэзіі зномы вылучаюцца сваѐй аўтаномнасцю, перш за ўсѐ таму, што нагадваюць празаічныя мініяцюры, сціснутыя часам да афарызма (хаця сам аўтар далучыў іх «да чыста паэтычных жанраў» [4, с. 7]). Можна гаварыць, што сематыка зномаў А. Разанава ў цэлым не даследавана. Звярнуўшыся да кнігі зномаў, мы вылучылі наступныя групы, семантычна звязаныя з зацікаўленасцю А. Разанава-паэта-філосафа: 1 Самарэфлексіі над фактамі побытавага жыцця «Пакуль чалавек жыве, ѐн усѐ яшчэ няпоўны, незавершаны, дарэшты не ўвасоблены, ѐн яшчэ не зусім творца і не зусім твор. Аднак дзякуючы гэтаму “не зусім” і магчыма далейшае ўвасабленне,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

магчымы Литературоведение 64 пераход недасканалага ў дасканалае, магчыма творчасць» [1, с. 10]. Гэта азначае, што чалавек на працягу свайго жыцця можа самаўдасканальвацца, інакш кажучы, ѐсць час на ўсѐ, пакуль жывеш. «Спазнай самога сябе… Але як нельга прымусіць нанава гарэць тое, што ўжо згарэла, – попел, як нельга яшчэ раз набыць рэч, якую маеш, так нельга спазнаць тое, чым ты ѐсць, і гэта таму, што яно, гэтае тое, ужо спазнанае: у сферы сутнасці жыць і ведаць – адно і тое ж» [1, с. 4] (карыстаючыся ведамі, будуеш жыццѐ так, як разумееш яго ты). «Спадчына – для нас усѐ яшчэ мерапрыемства. Для таго каб яна стала рэальным, а не ўмоўным фактарам культурнага жыцця і фактарам свядомасці, яна мусіць знаходзіцца не толькі там, але і тут, не толькі ў гарызантальным пласце сваѐй гістарычнай эпохі, але і ў вертыкалі пастаяннага дыялогу з наступнасцю» [1, с. 7]. Алесь Разанаў даводзіць, што сѐння мы павінны вывучаць спадчыну продкаў, каб перадаць нашчадкам. Разважае паэт і пра жыццѐвыя перашкоды, тым самым даводзячы, што не спрабуючы іх пераадольваць, чалавек будзе заставацца на месцы, не эвалюцыяніраваць. Цяжкасці вучаць нас быць моцнымі і надаюць нам вопыт змагацца, выпрацоўваць характар. «Не выходзячы ўсѐ нанова на “поле Крукшэтра”, не апынаючыся сам-насам перад сваім лѐсам, перад усѐ новай невядомасцю, губім у сабе космас магчымасцяў» [1, с. 31]. Сваімі зномамі Алесь Разанаў прапануе абсалютна новае разуменне некаторых станаў чалавека, напрыклад, смерці: «Час смерці, у якім усѐ згушчаецца, факусіруецца і пераацэньваецца, паказвае чалавеку, кім ѐн не павінен быць у жыцці…А не павінен ѐн перш за ўсѐ быць тым, хто захапляецца сабою, хто ўвасабляецца ў эгаізм, хто жывіць самасць, бо смерць – гэта, зрэшты, не што іншае, як смерць абмежаванасці, смерць “эга”» [1, с. 5]. 2 Тонкія назіранні над з’явамі літаратурнага працэсу Названая група зномаў з�much яўляецца самай шматлікай. У ѐй можна вылучыць асобна творы аб прызначэнні паэта, аб тым, што ѐсць мастацтва, пра паэтыку і паэзію і г. д. «У вершы, як у магічным люстэрку, відаць тая барацьба, якая адбываецца (альбо не адбываецца) у паэце паміж яго ўсѐчалавечым і асабовым “я”. Калі ў вершы гаворыць “асоба” – яе голас чуваць для яе самой, калі гаворыць”барацьба” – яе слухае ўсѐ наваколле, калі гаворыць “пераможца” – ѐн, нават не намагаючыся, каб чулі, чуццѐн усім ». [1, с. 8-9] 65 «Верш значны не гукам, які чуваць, пакуль верш чытаецца, а сваім рэхам, якое ѐн утварае, калі адгучыць» [1, с. 5]. «Кірунак і асаблівасць паэзіі: выказаць словамі тое, што проста так, па-за паэзіяй, выказаць немагчыма, – нявыказанае. Паэзія пачынаецца з немагчымасці казаць. Там, дзе змаўкае і адчувае сваѐ паражэнне асоба, адраджаецца паэт» [1, с. 61]. У А. Разанава наконт паэзіі ѐсць маленькая падказка: «У падмурку самых складаных мастацказнаўчых канцэпцый ляжыць звычайнае інтуітыўнае адчуванне: падабаецца – не падабаецца…» [1, с. 61-62]. Сапраўды, можа быць і так проста – падабаюцца ці не падабаюцца чытачу твае вершы. А ў наступным зноме аб паэзіі сказана больш дакладна: «Паэзія ў адрозненне ад жывапісу, не здольна “зафіксаваць” менавіта гэтае дрэва, менавіта гэтую птушку, менавіта гэтага чалавека. Але затое яна здольна на іншае – “фіксаваць” работу душы, якая спасцігла свет» [1, с. 37]. «Эфект творчасці: з цягам часу тое, пра што пішаш, становіцца тым, як пішаш, і тое, на што глядзіш, становіцца тым, як глядзіш» [1, с. 11]. Можна працягнуць паэта, што ў тым, што атрымліваецца, бачна асоба. Вельмі ѐмістыя і згушчаныя некаторыя зномы, у якіх аўтар трапляе ў самую сутнасць з�much явы, «прасвечвае яе сарцавіну»: «Мастацтва – ма(г)стацтва» [1, с. 31]. 3 Роздум над філасофскімі паняццямі «Вечнасць – не доўгі час, інакш яе б насельнікамі былі б адно камяні і бронза, а новая якасць жыцця і часу, і творыцца яна жывымі людзьмі» [1, с. 78]. «Веды – таксама ежа, разумовая, але ежа, і яна таксама можа быць не на карысць чалавеку, яна таксама можа нашкодзіць, і ад яе таксама неабходна час ад часу разгружацца – пасціць» [1, с. 9]. «Карані не трэба чапаць, ісціны ў іх няма: там адно толькі пануе змрок і высмейваецца жах. Ісціна каранѐў па-за імі, над імі – у кветцы» [1, с. 9]. Тое, што прайшло, асэнсавана. Ідзі наперад,ствырай будучыню. «Логіка – не перакананне. Яна як лінза: калі хочаш – рэчы праз яе можна ўбачыць буйнейшымі, калі хочаш – драбнейшымі» [1, с. 39]. Кожны бачыць рэчы, з�much явы па-свойму. Кожны па-свойму вытлумачвае рэчаіснасць. Спецыфіка семантычныай напоўненасці зномаў найперш заключаецца ў тым, што яны выражаюць суб�much ектыўнае разуменне паэтам А. Разанавым з�much яў рэчаіснасці. Лічым, што ў іх прысутнічае моцны суб�much ектыўны пачатак,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Литературоведение 66 што магчыма заключыць з таго шэрагу мастацкіх тропаў, якія сустракаюцца ў зномах. Напрыклад, «з цягам часу чалавек груганее» [1, с. 110] – метафара; «у вершы, як у магічным люстэрку» [1, с. 8] – параўнанне; «ралля адгукаецца рунню» – метафара [1, с. 83]; «верш закручваецца, як стужка Мѐбіўса» [1, с. 21]; «словы ўмеюць сябраваць і варагаваць» [1, с. 26]; «верш гаворыць» [1, с. 34]; «верш як трансмутацыйны апарат» [1, с. 42]; «рэгламентаваныя пошукі» – эпітэт [1, с. 53]; «інтэлект пазірае на свята» [1, с. 42] – метафара і іншыя. Даволі пашырана ў зномах і такая фігура як хіазм (перавернуты паралелізм), напрыклад: «Справа становіцца словам, каб слова ста-навілася справай» [1, с. 99]; «Хто ведае мову, уводзіць слова ў свет, хто ведае слова, выводзіць свет з мовы» [1, с. 95]; «Паэт мысліць тым, што вымаўляецца; філосаф вымаўляецца тым, што мысліць» [1, с. 89]; «Калі мастацтва – мастацтва, тады яно палітыка, калі мастацтва – палітыка, тады яно перастае быць і палітыкай, і мастацтвам» [1, с. 76]; «Жанр вынікае са стылю, стыль, кандэнсуючыся, акрэсліваецца ў жанр» [1, с. 31] і іншыя. Такім чынам, наяўнасць жанру зномаў, якім былі акрэслены творы, што склалі асобную кнігу паэта «Сума немагчымасцяў» (2009), выступае адным з вектараў праяўлення філасофскага мыслення Алеся Разанава. Гэта ў сваю чаргу вытлумачвае наяўнасць у арсенале зномаў твораў, падобных да афарызму разам з характэрнымі для дадзенага жанру прыкметамі. Менавіта хіазм як аснова, структурная мадэль некаторых зномаў, дае падставы паставіць знак роўнасці паміж зномам і афарызмам. У зномах А. Разанава яўна пераважае моцны суб�000ектыўны пачатак, які, хутчэй, збліжае зномы не толькі з афарызмам, але і з эсэ. У зномах дакладна акрэсліваецца індывідуальна-аўтарскае разуменне з‟яў рэчаіснасці. Творы А. Разанава вымагаюць наяўнасць рэцыпіента, які павінен не проста прачытаць, але ўчытацца, расчытаць знoм, разгарнуць усе прыхаваныя ў ім сэнсы. Вылучаныя намі семантычныя групы зномаў сведчаць пра схільнасць паэта да роздуму, аналітызму, жаданне шукаць і знаходзіць ісціну ў парадоксах і антыноміях чалавечага быцця. Больш за тое, усѐ гэта выступае прыкметай разанаўскага стылю [5].

Спіс літаратуры 1 Разанаў, А. Сума немагчымасцяў: зномы / А. Разанаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 122 с. 2 Штэйнер, І. Уводзіны ў невымоўнае: філасофія паэзіі Алеся Разанава / Іван Штэйнер. – Мінск : Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – 252 с. 3 “Я – той, хто шлях і хто па ім ідзе...” // Літаратура і мастацтва. – 1995. – 13 кастрычніка. – С. 6-7. 67 4 Лявонава, Е. А. Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і еўрапейскі літаратурны вопыт: дапаможнік для студэнтаў філал. фак. / Е. А. Лявонава. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т, 2002. – 128 с. 5 Аляшкевіч, Т. А. Фонасемантыка паэтычнага твора Алеся Разанава / Т. А. Аляшкевіч; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літаратуры; навук. рэд. М. А. Тычына. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 161 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ